ISSN 0321-1649 (print)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

*LITERARY SCIENCE*

УДК 821.161.3.09–3"19"

Паступіў у рэдакцыю 29.03.2016
Received 29.03.2016

**І. М. Шаладонаў**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ГЕНЕЗІС БЕЛАРУСКАЙ АПОВЕСЦІ XX СТАГОДДЗЯ

Рассматривается исторический и художественный процесс возникновения и развития жанра белорусской повести, а также дается обоснование актуализации этой прозаической формы в отечественной прозе XX столетия. Делается вывод о том, что жанровый принцип рассмотрения литературного процесса является наиболее эффективным и оправданным способом постижения теории, поэтики и эстетики художественно-литературного дискурса.

Особое внимание уделяется анализу взаимодействия разных прозаических форм, в особенности взаимосвязи жанров романа и повести. Отмечается тот факт, что изучению жанра повести в белорусском литературоведении долгое время не уделялось должного внимания. Ее жанровое определение часто носило фрагментарный, расплывчатый и неопределенный характер. Повесть нередко фигурировала в отечественном литературоведении под названием и определением других жанров прозы – рассказа, новеллы или же романа.

Значительное место в исследовании отведено глубокому теоретическому анализу произведения Якуба Коласа "В полесской глуши", осуществленному в статье «"В полесской глуши" как новый этап белорусской художественной прозы» литературоведом М. Пиотуховичем. Констатируется его высокая оценка этой повести в белорусской литературе.

Отмечается интенсивный характер развития повести в белорусской литературе 20-х гг. XX столетия, раскрывается продуктивная сущность этого жанра прозы, ее востребованный высокий поэтико-художественный потенциал для плодотворного развития национальной белорусской литературы.

*Ключевые слова:* художественная литература, проза, поэтика, эстетика, повесть, рассказ, роман, новелла, жанр, образ, прозаик, летопись.

**I. M. Shaladonau**

*Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Republic of Belarus*

## GENESIS OF THE 20TH CENTURY BELARUSIAN NOVEL

The article explores the historical and artistic process whereby the Belarusian novel genre emerged and developed and substantiates the relevance of this prose form in the Belarusian fiction in the 20th century. The conclusion is made that the genre-based approach to analyzing the literary process is the most effective and justified way to comprehending the theory, poetics and aesthetics of the fictional discourse.

Special attention is also paid to the analysis of the interaction between different prose forms, especially the interrelation between romance and novel. It is noted that studying the novel genre has long been neglected by Belarusian literary critics. Its genre definition was often much fragmented, vague and indefinite. The novel was often featured in the national literary criticism under a different name and defined as other prose genres: a story, novella or romance.

An important place in the study is given to the deep theoretical analysis of *In the Wilderness of Polesie* by Yakub Kolas presented by M. Piotukhovich in his article, *In the Wilderness of Polesie as a New Stage of Belarusian Fiction*. It is noted that he assessed this novel as highly valuable for the Belarusian literature.

The study also notes the intensive development of the novel in the Belarusian literature of the 1920s and exposes the productive nature of this fiction genre, and its relevant high poetic and artistic potential for the fruitful development of the Belarusian national literature.

*Keywords*: fiction, prose, poetics, aesthetics, novel, story, romance, novella, genre, image, prose writer, chronicle.

Літаратура ўвесь час развіваецца, дыферэнцыруецца, утвараючы ўсё новыя субдыскурсы, паколькі яна існуе ў часе і гісторыі. Адным з такіх значных і знамянальных субдыскурсаў у літаратуры, у яе паэтыцы з'яўляецца жанр. Менавіта пра яго знакаміты літаратуразнаўца і філосаф М. Бахцін гаварыў як пра "гістарычны вобраз часу" ў сваім агульнавядомым вучэнні аб хранатопе. "Жанр, – пісаў М. Бахцін, – ёсць прадстаўнік творчай памяці ў працэсе літаратурнага развіцця" [1, с. 120].

© Шаладонаў І. М., 2017

Трэба адзначыць, што кожны жанр літаратуры, згодна са сваім канонам і эстэтычнымі магчымасцямі, авалодвае і адлюстроўвае толькі пэўныя бакі наяўнай рэчаіснасці, дзе яму падпарадкаваны спецыфічныя прынцыпы адбору матэрыялу, замацаваныя за ім формы бачання і разумення свету, характэрныя толькі для яго межы ў раскрыцці шырыні ахопу і глыбіні пранікнення ў свет рэчаіснасці і псіхалогіі чалавека.

Жанр аповесці ў гэтым сэнсе ў айчыннай літаратуры мае, на нашу думку, магчыма, найбольшую глыбіню гістарычнай "пісьмова-вербальнай" памяці, бо экстрапалюе наш рэтраспектыўны позірк да знакамітага агульнага ўсходнеславянскага культурна-кодавага пісьмовага твора – летапісу "Аповесць мінулых гадоў", створанага яшчэ напачатку ХІІ стагоддзя ў Кіеўскай Русі. І хоць паняцце аповесці на той час яшчэ канкрэтна не мела выразных адзнак жанравага характару, але ўжо настойліва скіроўвала да тых вызначальных паэтыка-стылістычных і этычных дамінант і каардынат, якія затым стануць вызначальнымі і галоўнымі структурнымі адзнакамі жанравага напаўнення зместу новай аповесці.

Вызначальнай адзнакай і жанравай якасцю аповесці з'яўляецца яе паэтычны пафас светаадчування і светаадлюстравання, а таксама здольнасць да інтэнцыянальнасці (актыўнага самаразвіцця) і паспяховага засваення эстэтычнага, маральнага і жыццёвага вопыту гісторыі і чалавечага жыцця. Літаратурныя формы, якія звычайна мелі ў Сярэдневяковай Русі назву аповесці, вызначаліся ярка выяўленай этычнай афарбоўкай, антрапалагічнай цэнтрычнасцю. Як эстэтычная мастацкая форма аповесць да сённяшняга часу працягвае захоўваць сваю гістарычную родавую рысу, так званую "архаіку жанру", якая праяўляецца ў акцэнтаванай схільнасці да аксіялагічна-маральнай заангажаванасці.

Генетычна сучасная беларуская аповесць таксама звязана і з сярэдневяковымі аповесцямі "Аповесць пра Жыгімонта і Барбару Радзівіл", "Аповесць пра Баву": «Па сутнасці, аповесцямі з'яўляюцца і беларускія сярэдневяковыя перакладныя рыцарскія раманы "Александрыя", "Аповесць пра Трышчана", "Аповесць пра Таўдала" і інш.» [9, с. 73].

На пэўны час гэты жанр заняпаў, на што былі свае прычыны, звязаныя з негатыўнымі падзеямі, калі беларуская літаратура была пазбаўлена належных умоў для свайго развіцця. Беларуская ж аповесць ХХ стагоддзя – адзін з самых актыўных папулярных і запатрабаваных жанраў айчыннай літаратуры і разам з тым адна з найменш вывучаных літаратурных празаічных форм.

На фоне здавалася б адносна вялікай колькасці артыкулаў, прысвечаных аналізу асобных твораў ці аўтараў, якія паспяхова працуюць у жанры аповесці, здзіўляе мізэрная наяўнасць канкрэтных абагульняючых тэарэтычных даследаванняў па тэматыцы, паэтыцы і эстэтыцы гэтага жанру ў айчынным літаратуразнаўстве.

Да апошніх найбольш значных навуковых прац, прысвечаных жанру беларускай аповесці, мы можам аднесці такія літаратуразнаўчыя даследаванні, як "Беларуская савецкая проза. Раман і аповесць" (1971), "Беларуская проза ХХ стагоддзя: дынаміка жанравых структур" (1996) Л. Д. Сіньковай, "Праблема жанру і стылю ў беларускай прозе ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя" (2001) А. М. Макарэвіча, "Беларуская аповесць для юнацтва 20-х гадоў ХХ стагоддзя: стылёва-жанравая спецыфіка" (2004) В. М. Смаля. Кожная з гэтых літаратуразнаўчых прац высвечвае толькі пэўныя аспекты развіцця жанру беларускай аповесці ХХ стагоддзя, глыбока і дэталёва не закранае жанрава-відавы, стылёвы, родавы і тэматычны самарух айчыннай аповесці ў цэлым. Можа, па гэтай прычыне ў нашым літаратуразнаўстве і захавалася да сённяшняга дня даволі спрошчаная характарыстыка і тлумачэнне самога паняцця аповесці, якое было зафіксавана яшчэ пачынаючы з прац айчынных тэарэтыкаў літаратуры 20-х гадоў ХХ стагоддзя.

Так, М. Гарэцкі ў сваёй "Гісторыі беларускай літаратуры", выдадзенай у 1920 годзе ў Вільні, дае наступную інтэрпрэтацыю жанру аповесці: "Повесць – эпічны твор, у якім даецца шырокі малюнак жыцця грамадзянства ў пэўны час і ў пэўным месцы (тое ж самае, што і раман, толькі меншага аб'ёму і вузейшага зместу)" [5, с. 396].

Вядомы вучоны ў галіне паэтыкі літаратуры пачатку ХХ стагоддзя прафесар А. Барычэўскі ў сваёй навукова-тэарэтычнай працы "Паэтыка літаратурных жанраў" (1927) дае наступную інтэрпрэтацыю аповесці: «Часта побач з раманам ужываецца тэрмін "повесць". Яна адрозніваецца ад рамана больш простай фабулай, але калі яна багата апісальнымі момантамі, то можа не ўсту-

пацць яму па сваіх памерах. Беларуская літаратура мае толькі адзіночныя прыклады гэтага літаратурнага жанру, а іменна – "Сокі цаліны" Ц. Гартнага, "У палескай глушы" Я. Коласа, "Дзве душы" М. Гарэцкага» [1, с. 95].

У "Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў" за 1996 год пад рэдакцыяй М. А. Лазарука і А. Я. Ленсу азначэнне жанру аповесці толькі крыху пашыраецца і ўдакладняецца: «Аповесць – жанр эпічнай літаратуры, пераважна празаічнай. Ёсць, аднак, і ў паэзіі (вершаваная А.). Па сваіх памерах А. *знаходзіцца паміж раманам і апавяданнем, таму яе часта называюць сярэдняй эпічнай формай.* У адрозненне ад рамана А. мае менш складаны сюжэт, развівае звычайна адну сюжэтную лінію, звязаную з галоўным героем, які паказаны ва ўзаемаадносінах з іншымі персанажамі на працягу пэўнага, нярэдка даволі працяглага часу. Ад рамана і апавядання А. адрозніваецца не толькі аб'ёмам і характарам кампазіцыі, але і своеасаблівай, больш спакойнай, "замаруджанай" манерай апавядання. А. больш лірычныя, і таму ў А. часта апавяданне вядзецца ад імя галоўнага героя або аднаго з герояў. Аднак граніца паміж раманам і А даволі ўмоўная. Таму нярэдка жанр адных і тых жа твораў вызначаецца па-рознаму. Іх называюць то аповесцямі, то раманамі ("Салавей" З. Бядулі, "Люба Лук'янская" К. Чорнага)» [6, с. 176].

Уяўленне пра аповесць як жанр "прамежкавы" – у самых розных адносінах, але ў першую чаргу па памеры тэксту – паміж "вялікімі" празаічнымі формамі (эпапеяй і раманам) і "малымі" (апавяданнем і навелай) з тэарэтычнага і эстэтычнага пункта гледжання падаецца нам не зусім апраўданым і ў тэарэтычным плане недасканалым. Гэта думка, хутчэй за ўсё, ідзе ад той тэарэтыка-літаратуразнаўчай тэндэнцыі, якая лічыла, што галоўным жанрам XIX і XX стагоддзяў з'яўляецца жанр рамана як "новай празаічнай эпапеі", дзе жанрам апавядання і аповесці адводзілася толькі вузкая роля "падрыхтоўчых, вучнёўскіх" практыкаванняў для напісання будучага рамана.

Аднак уся гісторыя фарміравання новай беларускай празаічнай мастацкай літаратуры, пачынаючы ад В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Баршчэўскага і канчаючы сучаснымі маладымі празаікамі XXI стагоддзя, дае нам бясспрэчныя падставы лічыць, што жанр аповесці змяшчае ў сваім структурна-паэтычным змесце і ў формаўтваральнай унутранай патэнцыі магутны паўнавартасны зарад мастацка-эстэтычнага самавыяўлення аўтарскай волі ў раскрыцці чалавечых характараў, а таксама шматаспектных працэсаў гістарычнага і нацыянальнага жыцця.

Тэарэтыка-літаратуразнаўчая нявызначанасць жанру аповесці ў нашым сучасным літаратуразнаўстве, на нашу думку, тлумачыцца хутчэй за ўсё тым, што "*новая*" аповесць як літаратурны жанр – з'ява неардынарная і своеасаблівая ў сусветным літаратуразнаўстве, бо як жанр літаратуры аповесць не пазначана ў заходнееўрапейскім прыгожым пісьменстве, фігуруючы там часцей за ўсё пад знакам невялікага рамана ці некананічнай навелы.

Трэба адзначыць, што ва ўсходнеславянскіх літаратурах як стала замацаваны мастацка-эстэтычны і крытыка-тэарэтычны феномен *новая аповесць* найбольш выразна заявіла пра сябе толькі ў 1830-х гадах у рускай рэалістычнай прозе, пачынаючы са знакамітых "Аповесцей Белкіна" А. С. Пушкіна, і асабліва плённа раскрыла сябе ў такіх творах М. В. Гогаля, як "Нос", "Тарас Бульба" і інш. Першасную значную крытыка-тэарэтычную апрацоўку гэтыя аповесці атрымалі ў працах знакамітага рускага даследчыка літаратуры В. Р. Бялінскага. Так, аналізуючы рускую прозу ў артыкуле "Размежаванне паэзіі на роды і віды", В. Р. Бялінскі адзначаў: "Аповесць ёсць той жа раман, толькі ў меншым аб'ёме, які абумоўліваецца сутнасцю і аб'ёмам самога зместу" [3, с. 327].

Як можна заўважыць, крытык не рабіў поўнасцю тоеснымі паняцці рамана і аповесці, а толькі ўказваў на іх агульную родавую прыроду. Акрамя таго, аб'ём аповесці ён разглядаў не фармальна, а цесна ўвязваючы яго з жанравым зместам твора. Як вядома, высновы В. Р. Бялінскага бяруць пачатак з эстэтыкі Гегеля, які аб'ём твора тлумачыў прадметам і мэтай мастацкага адлюстравання.

Для нас важным у гэтым азначэнні рускага літаратуразнаўцы з'яўляецца яшчэ той аспект, што ён цесна збліжае працэс развіцця эстэтычнага "эпасу новай эпохі", г. зн. жанру рамана, з жанрам аповесці. Прычым агульнавядомымі і агульнапрынятымі сталі яго высновы наконт таго, што аповесць у нейкай меры можа выступаць "часткай рамана", якую даволі лёгка можна вылучыць з яго як самастойную мастацка-эстэтычную форму. Так, ён даводзіў, што "… аповесць – падзеленая на часткі, на тысячы частак раман, глава, вырваная з рамана" [4, с. 132].

Вядомы сучасны рускі тэарэтык літаратуры Н. Тамарчанка, грунтуючыся на вывучэнні празаічнага мастацка-літаратурнага працэсу развіцця жанру аповесці, прыйшоў да важнай, з нашага пункта гледжання, думкі аб тым, што кананічная форма новай рускай аповесці пачала складвацца ў XIX стагоддзі і гэты працэс актыўна працягваецца і па сённяшні дзень пры дзейсным узаемадзеянні з жанрам рамана і апавядання, дзе аповесць актыўна ўбірае і развівае новыя мастацка-тэматычныя і стылёва-паэтычныя формы і сэнсаўтваральныя напрацоўкі і якасці іх паэтычных практык.

Вельмі слушную думку на гэты конт, нам думаецца, выказаў у сваім даследаванні “Чалавек у савецкім рамане” Н. Перкін: «Ні “звычайны” раман, ні аповесць, ні нават апавяданне не з’яўляюцца толькі подступамі, “загатоўкамі”, а таксама не “прыватнымі” рашэннямі ў адносінах да эпапеі. Яны не толькі паўнакроўныя і незаменныя жанры, якія валодаюць неабмежаванымі магчымасцямі. Справа тут толькі ва ўзроўні, у якасці, у сапраўднай ці ўяўнай мастацкасці» [7, с. 219].

У пэўныя гісторыка-культурныя перыяды развіцця літаратурнага працэсу аповесць нават выходзіць на першы план у асэнсаванні і выяўленні галоўных і дамінуючых анталагічна-каштоўнасных, філасофскіх і духоўна-маральных праблем і задач у адлюстраванні сацыяльнай рэчаіснасці. Пры гэтым менавіта яна найбольш спрактыкавана магла прапаноўваць сябе на роўнавартасную замену папярэдніх варыятыўных форм вялікай эпічнай прозы, эпапеі і рамана як жанр, які, паводле выразу Шэкспіра, удала стварае “вобраз і напружанне часу”. З гэтай прычыны аповесць актыўна і прадукцыйна магла заяўляць аб сабе і самавызначацца, безумоўна, толькі ў працэсе абвостранай палемічнасці з раманнай паэтычнай формай, як найбольш генерыруючым і актуалізаваным мастацка-эстэтычным літаратурным жанрам XIX – XX стагоддзяў.

Гэты рэтраспектыўны дыскурс разваг аб развіцці расійскага літаратурнага і літаратуразнаўчага працэсу дазваляе больш фундаментальна і ўсебакова ўбачыць і зразумець шлях развіцця беларускай аповесці XX стагоддзя.

Пераходзячы непасрэдна да разгляду гісторыі развіцця новай беларускай аповесці, ёсць сэнс звярнуць асаблівую ўвагу на артыкул літаратуразнаўца М. Піятуховіча «Апавяданне “У Палескай глушы” як новы этап беларускай мастацкай прозы», надрукаваны ў Навуковым зборніку Інстытута беларускай культуры ў 1925 годзе. У гэтым артыкуле літаратуразнавец, які плённа працаваў на ніве беларускай літаратуры ў 1920-я гады, ужо ў назве свайго даследавання сцвярджае факт фарміравання *“новага этапу”* ў развіцці беларускай прозы са з’яўленнем гэтага празаічнага твора Я. Коласа, які ён апублікаваў у 1923 годзе пад псеўданімам Тарас Гушча.

І хоць па жанры М. Піятуховіч называе новы твор Я. Коласа толькі апавяданнем, але пры аналізе яскрава высвечваецца больш якасны і паўнавартасны характар напісанай празаічнай формы аповеду. Так, ужо ва ўводзінах свайго артыкула даследчык зазначае цікавую і важную для нас заканамернасць у гісторыі развіцця літаратуры: «Даўно ўжо зроблена назіранне, што ўсюды паэзія старажытней прозы. Гэтае назіранне некаторыя даследчыкі, як вядома, лічаць адным з агульных законаў гістарычнага руху літаратур. Беларуская літаратура прадстаўляе бліскучае пацвярджэнне дадзенай думкі» [8, с. 31].

З гэтай высновы вельмі важна яшчэ засведчыць тое, што беларуская празаічная аповесць найперш, так сказаць, пупавінна звязана з вершаванай аповесцю, даволі шырока прадстаўленай у беларускай літаратуры XIX стагоддзя ў творчасці В. Равінскага “Энеіда навыварат”, К. Вераніцына “Тарас на Парнасе”, В. Дуніна-Марцінкевіча з яго вершаванымі аповесцямі “Гапон”, “Вечарніцы”, “Шчароўскія дажынкі”, “Купалле”, Ф. Багушэвіча з яго сюжэтна-сацыяльнай паэмай “Кепска будзе”. Менавіта гэтыя пісьменнікі змаглі сваім дэмакратызмам паэтычнага і сацыяльнага мыслення ўнесці ў беларускую мастацкую прастору новага героя, героя з народа, які паступова станавіўся вызначальным фактарам не толькі сацыяльна-гістарычнага, але і мастацка-эстэтычнага засваення нацыянальнай паэтыкі жыцця.

Распрацоўка майстрамі вершаванай аповесці новых метадалагічных эстэтыка-паэтычных, мастацка-духоўных і стылёва-родавых падыходаў у адлюстраванні новых рэалій нацыянальнага жыцця не магла не ўвасобіцца ва ўдасканаленні і пашырэнні празаічных форм літаратурнага працэсу, калі на змену лірыка-сімвалічнай эстэтыкі пры стварэнні вобраза героя сцвярджалася новая паэтычная канцэпцыя пашырэння пабудовы сюжэта і вобразнай структуры, што прыво-

дзіла да змяшчэння родава-відавых спосабаў у спасціжэнні нацыянальнага быту і быцця. А ў літаратурным, мастацка-эстэтычным плане адбываўся акцэнтаваны зрух у працэсе пераходу ад жанраў паэзіі да жанраў прозы.

Гэты момант мастацкага росту беларускай прозы своечасова адзначыў і прафесар М. Піятуховіч, калі ў прыведзенай вышэй працы пра аповесць Я. Коласа "У палескай глушы" падкрэсліваў наступнае: "Гэта ў беларускай літаратуры, можна сказаць, першы досыць вялізны і, галоўнае, сапраўдны мастацкі твор у вобразнай і каларытнай прозе. Ужо ў гэтым заключаецца яго вялізнае значэнне для нашага пісьменства, *ён пашырае асадкі беларускай літаратуры з боку формы"* [8, с. 31].

У "Слоўніку-мінімуму па літаратуразнаўству", выдадзеным у 2000 годзе, В. Рагойша выказвае наступную думку: «Новая беларуская літаратурная аповесць (празаічная) з'явілася толькі напачатку ХХ стагоддзя ("Бацькава воля" Ц. Гартнага (1916), "Антон", "Дзве душы" М. Гарэцка-га (1919)). Сваё развіццё яна атрымала ў творчасці Якуба Коласа …» [9, с. 23].

Праўда, дзеля справядлівасці трэба зазначыць і той факт, што некаторыя даследчыкі не без падстаў лічаць першай празаічнай аповесцю новай беларускай літаратуры твор Я. Баршчэўскага "Драўляны дзядок і кабета Інсекта" з яго знакамітага зборніка "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях", выдадзенага ў 1844–1846 гадах у Санкт-Пецярбургу.

Іншыя літаратуразнаўцы схільны лічыць, і не без падстаў, першай спробай напісання беларускай аповесці твор Ядвігіна Ш. "Золата", які друкаваўся ў газеце "Беларусь" у Мінску за 1920 год, але не быў канчаткова завершаны. Маюць пэўную рацыю і тыя даследчыкі, якія да ліку адной з першых аповесцей, якія былі надрукаваны на тэрыторыі сучаснай Беларусі, адносяць гумарыстычна-прыгодніцкую аповесць В. Ластоўскага "Прыгоды Тараса і Панаса", выдадзеную ў Пінску ў мясцовай газеце за 1922 год.

Усе вышэйназваныя творы, безумоўна, пашыраюць творчыя набыткі беларускай аповесці, але аповесць Я. Коласа "У палескай глушы" адыграла ролю больш значнай, якасна-эстэтычнай і грамадскай падзеі менавіта як *новага этапу* літаратурна-празаічнага адлюстравання беларускай ментальнай рэчаіснасці.

У творы Тараса Гушчы, як зазначае М. Піятуховіч, «перад намі паўстае малюнак на шырокім палотнішчы, дзе зарысавана прырода, побыт сялянства, жыццё гэтак званай інтэлігенцыі правінцыяльнага кутка і, апроч таго, пастаўлена агульна-людская псіхалагічная праблема. Пры гэтым у адносінах да сялянства не заўважаецца ўжо народніцкай ідэалізацыі, а больш цвярозы і аб'ектыўны падыход да яго, а ў адносінах да інтэлігенцыі дадзена першая спроба тыпізацыі жыцця» [6, с. 35].

Аповесць "У палескай глушы" Я. Коласа – знамянальная з'ява нашага прыгожага пісьменства яшчэ і ў тым, што ў ёй ужо першапачаткова была закладзена ўнутрана-глыбінная раманная структурна-эстэтычная аснова мастацкага мыслення, якая затым рэалізавалася праз цыклічную форму аповесці – трылогію "На ростанях". Такая цыклічная празаічная форма стала пашыраным метадам далейшага функцыянавання нацыянальнай прозы ХХ стагоддзя.

Выдаўшы сваю першую аповесць, Я. Колас амаль адначасна дэклараваў аб сваім жаданні напісаць трылогію, дзе ў цэнтры яго ўвагі будзе жыццёвы лёс цэнтральнага героя твора нацыянальнага інтэлігента Андрэя Лабановіча. Гэты прынцып напісання можна таксама прасачыць і па тым, як працаваў і друкаваў па частках-аповесцях свой раман Ц. Гартны "Сокі цаліны".

Адсюль можна зрабіць вывад аб тым, што беларускі раман у ХХ стагоддзі арганічна развіваўся з аповесці, чэрпаючы з яе канфлікты, сістэму вобразаў, формы аповеду, прычым найбольш частым прыёмам арганізацыі сюжэта ранняга беларускага рамана з'яўляецца прыём ушчыльнення частак-аповесцей, што нагадвае сістэму вялікага эпічнага твора, але які лёгка можа распадацца на асобныя элементы, паколькі ў ім прысутнічае паслаблены агульны сюжэтна-фабульны і ідэйна-спрасаваны аб'яднаўчы пачатак, асноватворная манадная дамінанта.

Выразная мадальнасць беларускай аповесці ХХ стагоддзя як некананічнага жанру прозы дазваляе ёй быць актыўнай і адкрытай мастацкай структурай і жыватворна ўзаемадзейнічаць з іншымі жанрамі, убіраючы іх прадукцыйныя якасці і рысы, паспяхова і шматгранна папаўняючы і раскрываючы свой мастацка-ідэйны, стылёва-тэматычны і духоўна-маральны патэнцыял. Гэта

садзейнічала таму, што вялікая колькасць беларускіх празаікаў найбольш паспяхова і вынікова змаглі рэалізаваць сябе менавіта ў жанры аповесці, скарыстаўшы яе ўнікальныя мастацка-эстэтычныя і стылявыя магчымасці, вобразна-пераканаўча перадаваць духоўна-маральныя калізіі і канфлікты жыцця, а таксама сацыяльна-гістарычныя тыпы і характары людзей шмат у чым катастрафічнай і метамарфознай эпохі мінулага стагоддзя. Доказ таму – творы Я. Коласа, М. Гарэцкага, М. Зарэцкага, К. Чорнага, В. Быкава, І. Шамякіна, Я. Брыля, Я. Маўра, М. Стральцова, А. Федарэнкі, А. Казлова і інш.

Усё гэта дазволіла айчыннай аповесці ў XX стагоддзі стаць адной з самых прыкметных і запатрабаваных мастацка-літаратурных форм, якая заўсёды імкнулася паўнавартасна і адэкватна, наколькі дазвалялі ідэалагічныя ўстаноўкі, увасобіць і перадаць шматаспектную і шматмерную сацыяльна-грамадскую ментальна-прыродную сутнасць і аблічча беларуса.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Барычэўскі, А. Паэтыка літаратурных жанраў / А. Барычэўскі. – Менск: БДВ, 1927. – 167 с.

2. Бахтин, М. М. Собр. соч.: в 7 т. / М. М. Бахтин. – М.: Русские словари. Языки славянской культуры, 2002. – Т. 6: «Проблемы поэтики Достоевского», 1963. «Работы 1960 – 1970-х гг.». – 120 с.

3. Белинский, В. Г. Собр. соч.: в 9 т. / В. Г. Белинский. – М., 1959. – Т. 1. – 327 с.

4. Белинский, В. Г. О русской повести и повестях г. Гоголя / В. Г. Белинский. – М.: Современник, 1982. – 606 с.

5. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 395 с.

6. Лазарук, М., Ленсу, А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Народная асвета, 1996. – 176 с.

7. Перкин, Н. С. Человек в советском романе / Н. С. Перкин. – Минск: Наука и техника, 1975. – 304 с.

8. Піятуховіч, М. Апавяданне “У палескай глушы” як новы этап беларускай мастацкай прозы / М. Піятуховіч. – Мінск: Інстытут Беларускае культуры, 1925. – 39 с.

9. Рагойша, В. Слоўнік-мінімум па літаратуразнаўству / В. Рагойша. – Мінск : БДУ, 2000. – 123 с.

## References

1. Barycheǔski, A. (1927), *Paetyka litaraturnykh zhanraǔ* [The Poetics of Literary Genres], BDV, Minsk, BY.

2. Bakhtin, M. M. (2002), *Problemy poetiki Dostoevskogo* [The Problems of Dostoevsky’s Poetics], Moscow, RU.

3. Belinskii, V. G. (1959), *Sobranie sochinenii v 9 t. Tom 1* [Works in 9 Volumes. Volume 1], Moscow, RU.

4. Belinskii, V. G. (1982), *O russkoi povesti i povestyakh g. Gogolya* [About the Russian Novel and Novels by Gogol], Contemporary, Moscow, RU.

5. Garetski, M. (1992), *Gistoryya belaruskai litaratury* [The History of Belarusian Literature], Fiction, Minsk, BY.

6. Lazaruk, M. and Lensu, A. (1996), *Sloǔnik litaraturaznaǔchykh terminaǔ* [The Dictionary of Literary Terms], Public education, Minsk, BY.

7. Perkin, N. S. (1975), *Chelovek v sovetskom romane* [Man in the Soviet Romance], Science and Technology, Minsk, BY.

8. Piyatukhovich, M. (1925), *Apavyadanne "U paleskai glushy" yak novy etap belaruskai mastatskai prozy* [In the Wilderness of Polesie as a New Stage of Belarusian Fiction], Belarusian Institute of Culture, Minsk, BY.

9. Ragoisha, V. (2000), *Sloǔnik-minimum pa litaraturaznaustvu* [Minimum Dictionary of Literary Science], BSU, Minsk, BY.

## Информация об авторе

*Шаладонов Игорь Михайлович* – ст. науч. сотрудник. ГНУ “Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси” (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail : shaladonov@tut.by.

## Для цитирования

Шаладонаў, І. М. Генезіс беларускай аповесці XX стагоддзя / І. М. Шаладонаў // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 1. – С. 93–98.

## Information about the author

*Shaladonov Igor Mikhailovich*, Senior Scientific Researcher, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: shaladonov@tut.by.

## For citation

Shaladonau I. M. Genesis of the 20th Century Belarusian Novel. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 1, pp. 93–98.